100-годдзе святыні ў Зэльве

Аўтар: Паводле grodnensis.by
15.09.2013 01:00



3-4 жніўня, з нагоды святкавання 100-годдзя асвячэння касцёла Найсвяцейшай Тройцы, католікі Зэльвы перажывалі вялікую ўрачыстасць. Парафіяне пры--малі ша-ноўных гасцей: мітрапаліта Варшаўскага кардынала Казіміра Ныча, біс-купа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча, Правінцыяла ордэна айцоў клярэтынаў а. Кшыштафа Герада, ксяндзоў прэлатаў з Польшчы Міхала Багуту і Казіміра Кульпу, шматлікіх святароў з Гродзенскай дыяцэзіі, манаскіх сясцёр. Мітрапаліт Ныч 3-4 жніўня адправіў дзве святыя Імшы. 4 жніўня адбылася таксама ўрачыстая працэсія па вуліцах Зэльвы і асвячэнне памятнага знака на месцы былога касцёла.
†

Па словах пробашча парафіі кс. Яцэка Маркеля, юбілей парафіі святкуецца не адзін ці два дні. Святу папярэднічаў цэлы год малітоўнай і іншай падрыхтоўкі. З лістапада да канца чэрвеня па сем'ях парафіі перэгрынавалі пяць абразоў Вастрабрамскай Божай Маці, якія пробашч прывёз з Вільні, і кожны дзень святар маліўся разам з пяццю сем'ямі каля іх. Таксама зэльвенскія дзеці намалявалі свой родны касцёл і падрыхтавалі інсцэніраванае прад-стаўленне аб гісторыі зэльвенскай парафіі і касцёла, якое яны паказалі 3 жніўня парафіянам і гасцям. Падчас Вялікага посту вернікі перажылі місіі, якія падрыхтавалі айцы марыяне.

У сваёй гаміліі падчас урачыстасцей мітрапаліт Ныч падкрэсліў, што ўсе вернікі – гэта дзеці Божыя. "Мы абавязаны нястомна шукаць тое, што ў вышынях, але не адрывацца ад спраў гэтага свету, больш таго – мы павінны глыбока ўкараняцца ў іх. Папа Францішак паўтарае зноў і зноў: мы не супраць спраў гэтага свету, але абавязаны быць яго стражамі", – зазначыў кардынал. Па яго словах, "касцёл з'яўляецца чымсьці вельмі выключным: адраджаецца хутка, расце высока і заўсёды мае моц дароў для перадачы ўсім пакаленням". "Я здзіўлены, як хутка і добра вы адраджаеце свой касцёл на працягу толькі аднаго пакалення. Вы захавалі самае дарагое, што паходзіць ад Бога, – глыбокую і трывалую веру. Нягледзячы на праследаванне, касцёл тут заставаўся гатовым выконваць сваё першапачатковае прызначэнне. (...) У 90-я гады нам было да чаго вяртацца: людзі памяталі аб малітве, аб сваім выратанні з Бога, і ў гэтым вялікая заслуга вашых сем'яў, вашых бацькоў і дзедаў. Сям'я – гэта хатні касцёл, і нішто яе не заменіць ніколі", – сказаў мітрапаліт.

Кардынал Ныч ад імя ўсіх прысутных падзякаваў Богу за ўсіх будаўнікоў "гэтай

цудоўнай святыні ў стылі неаготыкі, якая сваімі ўзнёслымі вежамі паказвае людзям напрамак да Бога", і наказаў вернікам няспынна клапаціцца не толькі пра будынак, але і пра жывы Касцёл. "Беражыце і шануйце сваю святыню, будуйце на ёй сваю будучыню!"– адзначыў Казімір Ныч.

Падчас ура-чыс-тасцей мітрапаліт удзяліў сакрамант канфірмацыі 80-ці маладым парафіянам Зэльвы.